УДК 94(476)+902/904(476)+908(476)

***Аляксандр Мікалаевіч Вабішчэвіч***
*д-р гіст. навук, праф., праф. каф. гісторыі славянскіх народаў*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
***Aliaksandr Vabishchevich***
*Doctor of Historical Sciences, Professor,*
*Professor of the Department of the History of the Slavic Peoples*
*of Brest State A. S. Pushkin University*
e-mail: vabischev@rambler.ru

# АКАЛІЧНАСЦІ АРХЕАЛАГІЧНЫХ ЗНАХОДАК У ДАВЫД-ГАРАДКУ Ў 1936 г.

*Мэтай артыкула з'яўляецца раскрыццё акалічнасцей, у якіх адбывалася выяўленне археалагічных знаходак на Замкавай гары ў Давыд-Гарадку ў 1936 г. і падрыхтоўка да раскопак гарадзішча ў 1937–1938 гг. На падставе друку, архіўных дакументаў (частка з іх упершыню ўведзена ў навуковы ўжытак) выяўлена рэакцыя на археалагічныя знаходкі мясцовай праваслаўнай супольнасці, польскай каталіцкай інтэлігенцыі, адміністрацыйных уладаў, журналістаў, вучоных. Зроблена выснова пра тое, што прыярытэт навуковай і грамадскай значнасці пры ацэнцы выяўленых археалагічных артэфактаў дазволіў пераадолець міжканфесійныя супярэчнасці, групавыя кан'юнктурныя інтарэсы. У выніку гэтага Замкавая гара ў Давыд-Гарадку атрымала ахоўны статус, і там пачаліся палявыя археалагічныя даследаванні.*
***Ключавыя словы:*** *Давыд-Гарадок, археалагічныя даследаванні, гарадзішча, краязнаўчы рух.*

## The Circumstances of Archaeological Finds in David-Gorodok in 1936

*The purpose of the article is to reveal the circumstances in which the archaeological findings were discovered in David-Gorodok in 1936 and preparation for the excavations of the settlement in 1937–1938. On the basis of print, archival documents (some of them introduced into scientific use for the first time), the reaction to the archaeological findings of the local Orthodox community, Polish Catholic intelligentsia, administrative authorities, journalists, and scientists is determined. It was concluded that the priority of scientific and social significance in the evaluation of the discovered archaeological artifacts made it possible to overcome inter-religious contradictions and group opportunistic interests. As a result, protective measures were introduced regarding the archaeological monument in David-Gorodok and field archaeological research of the settlement began.*
***Key words:*** *David-Gorodok, archaeological research, settlement, local history movement.*

### Уводзіны

Выпадковае знаходжанне ў 1936 г. у ходзе земляных работ пры будаўніцтве праваслаўнай царквы рэшткаў сярэднявечнага гарадзішча, драўляных княжацкіх трунаў на Замкавай гары ў Давыд-Гарадку (цяпер горад у Столінскім раёне Брэсцкай вобласці) мела тады сенсацыйны характар і паслужыла падставай для правядзення там археалагічных даследаванняў. Вынікі праведзеных у 1937–1938 гг. раскопак былі падведзены польскім археолагам Р. Якімовічам у асобнай брашуры [1] і іншых яго публікацыях. Усяго было знойдзена 25 саркафагаў з чалавечымі астанкамі. Біяграфічныя звесткі пра гэтага даследчыка выкладзены ў польскім навуковым друку [2; 3], больш сціпла ў беларускіх энцыклапедычных выданнях [4; 5]. Абагульнены аналіз тых раскопак прысутнічае ў польскім спецыялізаваным археалагічным часопісе [6, с. 381–468].

У 1967 г. раскопкі гарадзішча Давыд-Гарадка праводзіў беларускі археолаг П. Лысенка [7; 8, с. 118–142; 9–11]. У 1937–1938 і 1967 гг. на Замкавай гары ў Давыд-Гарадку былі ўскрыты рэшткі зрубнага жылля, драўляных маставых, царквы, узгаданых трунаў, знойдзена шмат вырабаў з дрэва, бронзы, жалеза, косці, шкла, фрагменты керамічнага посуду і інш.

Звесткі пра раскоп гарадзішча ў Давыд-Гарадку прыведзены ў брашуры Г. Штыхава [12, с. 18]. Гісторыя Давыд-Гарадоцкага замка прааналізавана М. Ткачовым [13–14]. Агульная гісторыя Давыд-Гарадка коратка асветлена А. Егарэйчанкам [15], Ю. Якімовічам [16], у энцыклапедычным выданні пра гарады і вёскі Беларусі [17]. Інфармацыя пра археалагічныя даследаванні прысутнічае таксама ў краязнаўчых даследаваннях М. Шэлехава, аўтара шэрагу навукова-папулярных выданняў па гісторыі

гэтага старажытнага горада [18, с. 56–61; 19; 20, с. 49–54], а таксама ў публікацыях Л. Несцярчука [21, с. 15–17], Ю. Лабынцава [22, с. 62–63] і іншых аўтараў.

Мэтай дадзенага артыкула з'яўляецца раскрыццё акалічнасцей, у якіх адбывалася выяўленне археалагічных знаходак на Замкавай гары ў Давыд-Гарадку ў 1936 г. і падрыхтоўка да яе археалагічнага даследавання ў 1937–1938 гг. На падставе архіўных дакументаў, частка якіх упершыню ўводзіцца намі ў навуковы ўжытак, матэрыялаў перыёдыкі пастараемся высветліць рэакцыю на археалагічныя знаходкі мясцовай праваслаўнай супольнасці, польскай каталіцкай інтэлігенцыі, адміністрацыйных уладаў, прэсы, вучоных. У ходзе праведзенага даследавання прымяняўся шэраг метадалагічных падыходаў, у тым ліку антрапалагічны.

**Выяўленне археалагічных знаходак у Давыд-Гарадку ў 1936 г.**

Мястэчка Давыд-Гарадок Столінскага павета Палескага ваяводства ў 1921 г. налічвала 9 616 жыхароў. Як паведамляў у 1926 г. мясцовы бурмістр, там сярод гістарычных каштоўнасцей была Замкавая гара, *«якая паводле паданняў з'яўляецца месцам, дзе быў пабудаваны замак Радзівіла Чорнага. Слядоў замка не засталося. Зараз у валоданні праваслаўнага прыхода ёсць царква, пабудаваная больш за 80 гадоў назад. Музеяў і сабораў няма. Народныя строі зараз не захаваліся. Характэрныя рысы страціліся пад уплывам царскіх часоў і не адрозніваюцца нічым ад маламестачковых звычаяў Палесся»* [23, арк. 17–18].

Якраз у Давыд-Гарадку 6 мая 1936 г. адбыўся вялікі пажар: згарэла каля 176 двароў (прыблізна 280 пабудоў), пераважна дробных сялян, рамеснікаў і гандляроў, а таксама праваслаўная Свята-Васкрасенская царква на Замкавай гары на беразе ракі Гарынь. Страты ад пажару склалі каля 500 тыс. злотых. Было выплачана страхавой кампенсацыі на суму каля 300 тыс. злотых. Да канца 1936 г. было адбудавана каля 80 двароў [24, арк. 13адв.].

Страхавое таварыства выплаціла праваслаўнаму прыходу 42 тыс. злотых за згарэлую Свята-Васкрасенскую царкву. Па ініцыятыве мясцовых праваслаўных вернікаў вырашылі пабудаваць за ахвяраванні і атрыманую страхавую кампенсацыю новую, мураваную, царкву. Благачынны, выконваючы абавязкі бурмістра, протаіерэй Аляксандр Іванавіч Бяляеў, 1881 г. нараджэння, атрымаў у кастрычніку 1936 г. вусную згоду на выраб часткі абсіды для асвячэння вуглавога каменю. Тады ж разгарнулася капанне на Замкавай гары катлавана для падмурку царквы. Аднак у час будаўнічых работ у зямлі былі выяўлены шматлікія рэшткі драўляных пабудоў у добрай захаванасці. На глыбіні 4 м быў знойдзены памост з дубовых дошак, які быў разабраны, і выяўлена 13 трунаў. Па распараджэнні А. Бяляева труны былі разбіты, а чалавечыя астанкі былі перамешаны і закапаны ў іншым месцы на Замкавай гары.

Сам А. Бяляеў у 1900 г. скончыў Віленскае духоўнае вучылішча, з 1902 г. настаўнічаў у царкоўна-прыходскіх школах Віленскай губерні. У 1915–1918 гг. з'яўляўся вайсковым святаром у расійскай арміі, атрымаў кантузію на фронце. У 1918–1921 гг. быў праваслаўным святаром у Варонежскай губерні. Пасля рэпатрыяцыі з 1921 г. ён служыў настаяцелем царквы ў Харошчы Беластоцкага павета, з 1922 г. – настаяцелем царквы ў Шэбрыне Брэсцкага павета, у 1934 г. быў пераведзены з Сарнаў у Давыд-Гарадок [25, арк. 15адв.–16адв.; 26, арк. 66адв.–67].

Больш дэталёва аб храналогіі падзей, звязаных з гэтымі археалагічнымі знаходкамі ў Давыд-Гарадку, можна прасачыць па дакладной запісцы старасты Столінскага павета Генрыка Кінтопфа палескаму ваяводзе Вацлаву Костэк-Бярнацкаму ад 17 снежня 1936 г. «Будаўніцтва праваслаўнай царквы ў Давыд-Гарадку і археалагічныя знаходкі». Гэты архіўны дакумент публікуецца ўпершыню. Прыводзім яго цалкам ва ўласным перакладзе з польскай мовы.

*«Дакладваем, што паводле праведзенага разбіральніцтва справа будаўніцтва царквы ў Давыд-Гарадку выглядае наступным чынам.*

*Капанне падмуркаў для будаўніцтва царквы пачалося 9.10.1936 г. Мулярскія і бетонныя працы пачаліся 20.10.1936 г. 24 кастрычніка адбылося асвячэнне праваслаўным архіепіскапам Аляксандрам* (Аляксандр (Іназемцаў) (1889–1948), епіскап Польскай праваслаўнай царквы, архіепіскап Палескі і Пінскі) *вуглавога каменя.*

*На труны патрапілі 20 ці 21.X., аб чым 23.X. паведаміў лістом ваяводскаму*

*ўпраўленню, адначасова вусна загадаўшы в. а. бурмістра свяшчэнніку Бяляеву адпаведным чынам захоўваць знаходкі. Труны перанесены на іншае месца на Замкавай гары і закапаны ў зямлі. На падставе распараджэння ваяводскага ўпраўлення 28.X.36 г. мною выдадзены загад будаўнічаму камітэту і гарадской управе зберагчы ўсе знаходкі да прыбыцця кансерватара і ўстрымацца ад работ у тых мясцінах, дзе натыкнуліся на археалагічныя знаходкі.*

*5 лістапада 1936 г. на месца прыбыў кансерватар д-р Дуткевіч* (Юзаф Дуткевіч (1903–1968), польскі гісторык, часовы кансерватар Люблінскай кансервацыйнай акругі ў 1935–1939 гг.) *з Лubліна, які пацвердзіў археалагічную вартасць трунаў, накіраваў прама ў ваяводскае ўпраўленне просьбу аб поўным спыненні работ да часу прыбыцця археолага. Распараджэнне непасрэдна ад начальніка Сакалоўскага аб поўным спыненні работ да прыезду археолага і яго рашэння мною перададзена 5.11. гарадской управе, а пісьмовае распараджэнне выслана 6.11. Тое распараджэнне будаўнічы камітэт атрымаў толькі 9.11., калі спынілі работы.*

*9.11. бягучага года на месцы труны даследаваў дацэнт, д-р філасофіі Раман Якімовіч* (Раман Якімовіч (1889–1951), польскі археолаг, з 1929 г. дырэктар Дзяржаўнага археалагічнага музея ў Варшаве), *дырэктар Дзяржаўнага археалагічнага музея.*

*10.11. бягучага года д-р Якімовіч быў у мяне ў старостве і паведаміў, што знойдзеныя труны – гэта саркафагі, у якіх хавалі памерлых на працягу некалькіх стагоддзяў, складвалі трупы, спод выкладзены ў зямлі, як у гэтым выпадку, расколатымі папалам драўлянымі пнямі, злучанымі крукамі. На маё пытанне аб археалагічнай вартасці гэтых трунаў паведаміў мне, што можна іх залічыць як да XI, так і да XV, XVI стагоддзяў, што ў гэтых трунах знаходзяцца некаторыя прадметы, якія могуць дакладней акрэсліць час паходжання, а вартасць іх з боку археалогіі не такая значная, як спачатку дапускалася. Аб спосабе іх захавання не прадстаўлены ніякія яго пажаданні.*

*Адносна аднаўлення работ з-за нагрувашчвання будаўнічых матэрыялаў, якія могуць знішчыцца (цэмент), а таксама ў канцы будаўнічага сезону, дырэктар Якімовіч пярэчанняў не зрабіў, аднак мяне папрасіў устрымацца да 12.11., каб паразумецца з галоўным кансерватарам праф. Рэмерам* (Ежы Рэмер (1888–1979), польскі гісторык мастацтва, у 1930–1937 гг. генеральны кансерватар помнікаў), *а пра яго рашэнне пазвоніць па тэлефоне ці дашле дэпешай.*

*13.11. даў згоду на правядзенне цэментных і мулярскіх работ на падмурках, якія ўжо выкапаны раней.*

*18.11. скончаны мулярскія работы, а 1.12. усе іншыя.*

*Пры электрычным святле праведзены работы толькі 18.11. з 8 [гадзін] раніцы да 16.30.*

*Месца для будаўніцтва вечарамі пастаянна асветлена, каб прадухіліць магчымыя няшчасныя выпадкі з людзьмі.*

*Праведзены наступныя работы:*

*1) поўнасцю выкапаны падмуркі;*

*2) пакладзена бетонная пліта ў глыбіню на 70 см пад увесь будынак;*

*3) закладзены поўнасцю мур фундамента пад алтар;*

*4) паўднёвы бок фундамента выведзены на 1 метр;*

*5) знаходкі захаваны належным чынам.*

*Кіраўнік дарожнай управы ў час разбіральніцтва сцвярджаў, што пры аднаўленні работ пасля 13.11. бягучага года не трапляліся новыя археалагічныя знаходкі, старыя не пашкоджаны.*

*Такім уяўляецца фактычны стан работ і захавання археалагічных знаходак, што ўжо даследаваны спецыялістамі. Так як на Замкавай гары выкапана толькі вузкая паласа зямлі пад падмуркі, то як з унутранага, так і знешняга боку гэтых равоў могуць яшчэ знаходзіцца ў глыбіні зямлі іншыя археалагічныя знаходкі, і магчымыя пошукі археолагаў вясной нічуць не будуць абмежаваны.*

*Адначасова вымушаны патлумачыць сітуацыю адносна артыкула ў "Dzienniku Brzeskim" ад 30.XI.36 г. № 144 (Артыкул "Dyktatura naukowa szewców w Polsce", перадрукаваны з газеты "Słowo" (1936. – 29 listopada)). Замкавая гара, на якой пару стагоддзяў стаяла праваслаўная царква, з'яўляецца самым высокім і прывабным месцам у Давыд-Гарадку. Цяпер, пасля пажару праваслаўнай царквы, некалькі палякаў-інтэлігентаў у Давыд-Гарадку трымаюцца*

*думкі не дапусціць будаўніцтва царквы на тым жа месцы, а зачэпкай для гэтага з'яўляюцца, у прыватнасці, гэтыя археалагічныя знаходкі і на іх падставе – гістарычная значнасць Замкавай гары.*

*Адносна самога артыкула ў "Дзенніку Брэсцкім", што з'яўляецца толькі фантазіяй журналістаў, у недапушчальнай форме звязвае постаць Пана Прэзідэнта Польскай рэспублікі* (Ігнацы Масціцкі (1867–1946), польскі палітык і вучоны, у 1926–1939 гг. прэзідэнт Польшчы) *з шаўцамі з Давыд-Гарадка, сцвярджаю, што ні пасол Фрэйман* (Ян Фрэйман (1900–1970), польскі грамадскі дзеяч, у 1935–1938 гг. – пасол (дэпутат) польскага сейма ад акругі (Пінскі, Лунінецкі і Столінскі паветы Палескага ваяводства))*, таксама ніхто з канцэлярыі Пана Прэзідэнта па тэлефоне па гэтай справе са мной не звязваўся.*

*Павятовы стараста Генрык Кінтопф». 17.12.[1936]* [27, арк. 6–7].

Як бачым, з 9 кастрычніка 1936 г. на Замкавай гары ў Давыд-Гарадку пачаліся земляныя, а потым і непасрэдна будаўнічыя работы па ўзвядзенні падмурка царквы. 20 ці 21 кастрычніка былі выяўлены дубовыя труны. Толькі праз 2–3 дні пасля гэтага Столінскае павятовае староства пісьмова праінфармавала Палескае ваяводскае ўпраўленне ў Брэсце пра падзею. І толькі атрымаўшы адтуль адпаведнае распараджэнне 28 кастрычніка (г.зн. праз 5 дзён) павятовы стараста загадаў устрымацца ад будаўнічых работ, аднак толькі там, *«дзе натыкнуліся на археалагічныя знаходкі»*. Такім чынам, пачатыя 9 кастрычніка работы не былі спынены, а прадоўжыліся.

**СМІ аб археалагічных знаходках у Давыд-Гарадку.**

Нешматлікае кола польскай інтэлігенцыі Давыд-Гарадка, католікаў па веравызнанні, выступіла ў абарону археалагічных артэфактаў, надаўшы падзеі гучны рэзананс у перыядычным друку (у адзначанай дакладной запісцы – *«некалькі палякаў-інтэлігентаў»*, без указання іх прозвішчаў). Павятовым старастам іх пазіцыя адназначна тлумачылася жаданнем *«не дапусціць будаўніцтва царквы»* (менавіта праваслаўнай царквы).

Сярод тых польскіх інтэлігентаў быў Альфонс Тускевіч (Alfons Tuskiewicz), натарыус іпатэчнага адзела Пінскага акруговага суда, канцылярыя якога знаходзілася ў Давыд-Гарадку. *«Цэлы дзень закопаны ў сваёй натарыяльнай канторы, можна сказаць, пастаронняя асоба, але вось у вольныя хвіліны займаецца даследаваннямі, вывучае, робіць, што можа,* – адзначаў на старонках віленскай газеты "Słowo" публіцыст Юзаф Мацкевіч (1902–1985). – *Хто ведае, ці не яму гэта трэба падзякаваць, што ўзняў "крык" і навіна пра вялікую археалагічную знаходку трапіла ў прэсу і цяпер ужо не загіне»* [28]. У верасні 1936 г. да асвячэння пабудаванага ў Давыд-Гарадку касцёла Божага Цела А. Тускевіч разам з суддзёй Давыд-Гарадоцкага гарадскога суда, былым паслом (дэпутатам) польскага сейма Янам Бродацкім (1882–1943), паручнікам Альфонсам Ваньтоўскім (1892–1939) падрыхтаваў брашуру «Эха з Палескай пушчы» («Echa z Puszczy Poleskiej»). Кніга была прысвечана вядомаму краязнаўцу Раману Гарашкевічу, а яе мэтай было ўзмацненне польскасці і каталіцкай веры сярод палешукоў. А. Тускевіч у гістарычным нарысе пра Давыд-Гарадоцкі касцёл лічыў яго існаванне *«павелічэннем польскага стану валодання»*, а саму рымска-каталіцкую царкву на «крэсах» – *«крэпасцю і знічам культуры заходняй цывілізацыі»* [29, с. 26]. Якраз А. Тускевіч узначаліў асобны Давыд-Гарадоцкі аддзел Польскага краязнаўчага таварыства, які ў 1937 г. налічваў 19 чалавек, у 1938 і 1939 гг. – 40 чалавек [30, с. 79]. Гэтая арганізацыя прытрымлівалася ідэй рэгіяналізацыі, спрыяла пашырэнню польскай культуры і гістарычнай свядомасці, г. зн. паланізацыі заходнебеларускага насельніцтва [31, с. 20, 82, 88].

Яшчэ адным актывістам з кола мясцовай польскай інтэлігенцыі быў настаўнік Тэафіл Етсхін (Teofil Etschin). Ён нарадзіўся ў Тарнопалі ў 1878 г. у каталіцкай сям'і сталяра Францішка Ецхіна (1851 г. нар.), яго жонкі Тэклі (1849 г. нар.). У ліпені 1899 г. сярод выпускнікоў Тарнопальскай настаўніцкай семінарыі атэстат сталасці атрымаў і Т. Етсхін [32]. З таго часу з невялікімі перапынкамі настаўнічаў. У 1914 г. быў мабілізаваны ў аўстра-венгерскую армію, у 1915–1918 гг. знаходзіўся ў расійскім палоне. У 1920–1922 гг. займаўся школьнай інспекцыяй на Віленшчыне, а з 1929 г. пачаў працаваць настаўнікам польскай грамадскай усеагульнай школы № 1 у Давыд-Гарадку.

Летам 1938 г. на старонках польскага друку з'явілася паведамленне, што школьны настаўнік у Давыд-Гарадку Тэафіл Етсхін ахвяраваў 2 тыс. злотых з уласных ашчаджаных грошай для ўзгаданага ўжо касцёла ў Давыд-Гарадку [33–34]. У лістападзе 1938 г. Т. Етсхін быў адзначаны папячыцельствам Брэсцкай школьнай акругі сярэбраным медалём *«за шматгадовую службу»*, а ў лютым 1939 г. 60-гадовага настаўніка адправілі на пенсію [35, арк. 1, 3, 6–7].

Менавіта пасля звароту натарыуса А. Тускевіча ў Вільню ў рэдакцыю газеты «Słowo» там вырашылі звярнуцца да Антона Іванавіча Луцкевіча (1884–1942), старшыні Беларускага навуковага таварыства і дырэктара беларускага музея. Яму прапанавалі прыняць удзел у экспедыцыі ў Давыд-Гарадок, каб высветліць характар і значэнне археалагічнай знаходкі. Гэтае наведванне А. Луцкевічам Давыд-Гарадка наогул не згадваецца ў дакладной запісцы столінскага павятовага старасты ад 17 снежня 1936 г.

Візіт А. Луцкевіча ў Давыд-Гарадок адбыўся да 5 лістапада, г. зн. да прыезду туды Ю. Дуткевіча з Любліна. Ужо 7 лістапада ў нумары газеты «Słowo» пад рубрыкай «Сенсацыйнае адкрыццё ў Давыд-Гарадку» А. Луцкевіч падзяліўся ў гутарцы з Ю. Мацкевічам уласнымі ўражаннямі і першымі высновамі. Ён адразу абверг яцвяжскае паходжанне адкапаных трунаў: *«Сёння мы можам бясспрэчна сцвердзіць тое, што знаходка належыць да хрысціянскага перыяду… у часы, калі Давыд-Гарадок выконваў асабліва важную палітычную і ваенную ролю.… Ключ да пазнейшай Белай і Чырвонай Русі. Адыгрываў тады вялікую ролю, а адбывалася гэта больш-менш у XII веку»* [28].

А. Луцкевіч не сумняваўся, што ў магілах пахаваны мясцовыя князі. *«Трэба дапускаць, што ў Давыд-Гарадку знойдзены іх труны і там спачываюць іх астанкі»*. Яго ўразілі гэтыя самыя драўляныя грабніцы: *«Прымітыўнасць самога пахавання. Нідзе няма слядоў пілы. Дрэва, абрубкі, дошкі не прапілены. Нідзе жалеза!.. Труны такога кшталту ў нас не сустракаліся»*. Для яго заставалася невядомым і патрабавала далейшага даследавання, ці былі спустошаны магілы: *«Найбольш праўдападобным з'яўляецца тое, што гэтыя труны былі ўжо разрабаваны. Кім?»* [28].

У час той экспедыцыі яго ўдзельнікі звярнуліся з просьбай да благачыннага А. Бяляева: *«Пабудаваць склеп пад новай царквой, паставіць там княжацкія труны ў іх дубовых саркафагах. Няхай маюць годны спачын. Няхай турысты і паломнікі на ўласныя вочы бачаць, якая старажытная культура і гісторыя Давыд-Гарадка»*. І атрымалі адказ: *«Дзе там, няма грошай на склеп…»*.

У гэтым жа артыкуле ў адным з падзагалоўкаў раздзела пастаўлена дылема: *«Людзі добрай волі і людзі, абыякавыя да абавязку»*. З аднага боку, выказана ўдзячнасць *«людзям добрай волі»*, г. зн. неабыякавым грамадзянам (сярод іх натарыусу А. Тускевічу, неназваным па прозвішчах настаўніку Т. Етсхіну, *«яшчэ два, тры чалавекі»*), якія рашуча выступілі за захаванне знойдзеных археалагічных артэфактаў, данеслі інфармацыю пра іх у СМІ. З другога боку, быў кінуты папрок аб бяздзейнасці і абыякавасці ў бок польскіх чыноўнікаў, *«якім дзяржава плаціць і што займаюць адпаведныя пасады»*, бо наступіў *«найвышэйшы час, каб гэтыя людзі адыйшлі са сваіх "пастарункаў" да… працы»* [28].

І завяршалася гэтая першая газетная прэзентацыя вынікаў экспедыцыі кароткім заключэннем: *«У Давыд-Гарадку адбыліся важныя і знамянальныя адкрыцці для культуры і гісторыі краіны. Яны не могуць пайсці ў нябыт!»* [28]. Больш падрабязная справаздача была выкладзена А. Луцкевічам у артыкуле «Княжыя магілы ў Давыд-Гарадку» ў заходнебеларускім літаратурна-навуковым часопісе «Калоссе» [36].

З той паездкі ў Давыд-Гарадок А. Луцкевіч прывёз у беларускі музей у Вільні 2 пары пантофляў з ласінай скуры і рэшткі керамікі, якія дастаў рукамі са сцяны выкапанай траншэі. Рэшткі керамікі былі пасланы на экспертызу Яраславу Іванавічу Пастэрнаку (1892–1969), прафесару Львоўскай багаслоўскай акадэміі, які прызнаў, што ў ніжніх пластах кераміка датавалася XII ст., у верхніх – XVII–XVIII стст. Трэба дадаць, што высокая навуковая кваліфікацыя Я. Пастэрнака пацвердзілася праз некалькі гадоў – пры археалагічным адкрыцці ў Галічы Успенскага сабора з саркафагам князя Яраслава Осмамысла (за гэта археолага ў сяброўскім коле назвалі «*украінскім Шліманам*»).

Толькі 5 лістапада 1936 г. у Давыд-Гарадок наведаўся кансерватар Люблінскай акругі Ю. Дуткевіч. Праз ваяводскія ўлады ўдалося дабіцца рашэння аб спыненні будаўнічых работ (да прыбыцця археолага). Пра гэта была праінфармавана і праваслаўная кансісторыя ў Пінску. *«Рэч зразумелая, што Люблін мала цікавіцца чужым яму і няведамым Палессем,* – адзначаў А. Луцкевіч. – *Дык не зацікавіўся люблінскі кансерватар і давід-гарадоцкай знаходкай. Работ не спынілі: работнікі капалі далей і нішчылі ўсё, што ім замінала ў рабоце»* [36, с. 113].

Толькі 9 лістапада, пасля атрымання пісьмовага распараджэння, на месцы былі спынены будаўнічыя работы. Менавіта тады ж у Давыд-Гарадок прыехаў археолаг Раман Іванавіч Якімовіч, дырэктар Дзяржаўнага археалагічнага музея ў Варшаве і прафесар Познаньскага ўніверсітэта, які правёў першаснае даследаванне трунаў.

12 лістапада Р. Якімовіч у лісце да начальніка камунікацыйна-будаўнічага аддзела Палескага ваяводскага ўпраўлення паведамляў аб праведзеным пробным даследаванні ў Давыд-Гарадку. *«Дакладнае ўстанаўленне часу адкрытых археалагічных знаходак, асабліва драўляных саркафагаў, натыкаецца на цяжкасці з-за адсутнасці датаваных знаходак і наогул вялікай беднасці старажытных прадметаў»* [37, с. 382]. 16 лістапада Р. Якімовіч у чарговым лісце таму ж адрасату інфармаваў пра вынікі канферэнцыі з ваяводскім кансерватарам. *«Вясной 1937 г. на Замкавай гары ў Давыд-Гарадку трэба абавязкова правесці раскопкі з-за навуковай важнасці адкрытых знаходак. Адзначаю, што ўдалося сцвердзіць, што Давыд-Гарадок у XII стагоддзі быў сталіцай удзельнага г. зв. Гарадзенскага княства. Раней памылкова сталіцай гэтага княства лічылі Гарадную. Больш таго, знойдзеныя труны на Замкавай гары ў Давыд-Гарадку ўтрымліваюць астанкі гарадзенскіх князёў – Давыда Ігаравіча, заснавальніка Давыд-Гарадка, яго жонкі, якую невядома як звалі, яго сына Усеваладка, і ўнукаў Барыса, Глеба і Мсціслава, разам з жонкамі»* [37, с. 382]. Трэба дадаць, што 13 лістапада ў Давыд-Гарадку былі адноўлены будаўнічыя работы, якія працягваліся да 1 снежня.

Усе гэтыя падзеі, звязаныя з выяўленнем археалагічных знаходак, а таксама са скандальным спыненнем і аднаўленнем будаўнічых работ на Замкавай гары, сталі аб'ектам увагі СМІ. *«Мы нарабілі вакол Давыд-Гарадка вялікі і заслужаны шум, зусім гэтага не саромемся, калі хтосьці запіша яго на рахунак нашай рэдакцыі»,* – адзначаў той жа журналіст газеты «Słowo» Ю. Мацкевіч [38]. Польскія вучоныя (у тым ліку Р. Якімовіч) выступалі за спыненне *«скандальнага знішчэння каштоўнасцей, за спыненне капання і ўмацавання фундаментаў для новай царквы – для захавання таго, што яшчэ заставалася ў зямлі, каб дастаць вясной»* [27, арк. 15].

Якраз на старонках газеты «Słowo» быў выдадзены артыкул «Навуковая дыктатура шаўцоў у Польшчы» [39], які быў перадрукаваны ў іншых выданнях, у прыватнасці, у газетах «Dziennik Brzeski» [40], «Słowo Polesia» (Пінск). У артыкуле сцвярджалася, што праз некалькі дзён пасля 9 лістапада, калі былі спынены будаўнічыя работы, быццам два давыд-гарадоцкія шаўцы паехалі для ўрэгулявання гэтага пытання ў Варшаву ў каралеўскі палац да прэзідэнта Польшчы І. Масціцкага, вялікага аматара паляўніцтва, з прэзентам – з доўгімі паляўнічымі ботамі. У суправаджэнні пасла (дэпутата) Яна Фрэймана яны атрымалі дазвол прадоўжыць будаўнічыя работы на Замкавай гары ў Давыд-Гарадку [27, арк. 15]. Аднак у згаданай дакладной запісцы ад 17 снежня 1936 г. столінскі павятовы староста называў гэтую інфармацыю ў друку *«фантазіяй журналістаў»*. Варта дадаць, што І. Масціцкі ў міжваенны час замаўляў абутак у давыд-гарадоцкіх майстроў. Вопытны шавец Якаў Іванавіч Матусевіч атрымаў за гэта падзяку ад польскага прэзідэнта.

У ходзе праведзенага павятовымі ўладамі разбіральніцтва благачынны А. Бяляеў паведаміў, што *«труны закапаны ў іншым месцы... без дазволу кансервацыйных уладаў»*. У сваю чаргу, тэхнік-будаўнік Уладзімір Галкін, 1898 г. нар., заявіў, што *«не далажыў пра гэта кансервацыйным і адміністрацыйным уладам, а дапусціў раскопванне і знішчэнне названых каштоўнасцей»*, і тлумачыў гэта тым, што не ведаў пра адпаведны закон (г. зн. распараджэнне прэзідэнта Польшчы аб ахове помнікаў ад 6 сакавіка 1928 г.) і знішчыў археалагічныя знаходкі па распараджэнні А. Бяляева [27, арк. 50–51]. Пасля разбіральніцтва сітуацыя быццам су-

пакоілася, былі атрыманы адпаведныя гарантыі.

Папярэднія вынікі даследавання археалагічных знаходак у Давыд-Гарадку былі апублікаваны Р. Якімовічам у канцы 1936 г. у шэрагу польскіх газет [41–43]. Так, на старонках віленскай газеты «Słowo» ён найперш вырашыў зноў коратка падзяліцца разгадкай таямніцы давыд-гарадоцкіх трунаў. Абвергнуў назву (Horodno, Гарадная) сталіцы пагарынскага княства (быццам выпраўленую ў летапісе). *«Гарадная ляжыць удалечыні ад рэк, здалёк ад сухапутных шляхоў зносін, на вялікай выспе, акружана навокал вялізным і цяжкім для праходу балотам Марочна* (Марочна – самае старажытнае балота Беларусі, цяпер адно з буйнейшых верхавых балотаў Заходняга Палесся. У 2015 г. быў заснаваны рэспубліканскі водна-балотны заказнік «Марочна» ў Столінскім раёне Брэсцкай вобласці»). З прызнаннем сталіцы Давыд-Гарадка вырашалася і загадка знойдзеных трунаў. *«Аб тым, што там пахаваны князі, не можа быць ніякага сумнення… Давыд-гарадоцкая загадка была б вырашана. Да яе вырашэння спрычынілася грубае перарванне вечнага спачыну. Тым больш, трэба шкадаваць, што княжацкія шкілеты былі перамешаны, бо гэта ці не адны з першых магілаў, у якіх нябожчыкаў можна назваць па імені. Мы павінны забяспечыць ім належную пашану, а з нечаканага адкрыцця патрэбна атрымаць поўныя навуковыя вынікі»* [42].

**Ахоўныя меры і падрыхтоўка да правядзення раскопак 1937–1938 гг.**

11 лютага 1937 г. Замкавая гара ў Давыд-Гарадку была ўнесена ў адпаведны рэестр помнікаў у Палескім ваяводстве. У сувязі з гэтым 12 сакавіка 1937 г. было забаронена правядзенне будаўнічых работ на Замкавай гары.

Нязгодны з такім рашэннем благачынны А. Бяляеў як прадстаўнік мясцовай праваслаўнай супольнасці накіраваў некалькі лістоў царкоўным уладам і польскай адміністрацыі. Так, у лісце ў Палескую праваслаўную кансісторыю дакладваў наступнае. *«Перш за ўсё няма ніякіх падстаў для прызнання помнікам узгорка, г. зв. Замкавай гары, бо гэта не заснавана на такіх навуковых даных, па якіх можна было б рабіць высновы… Бо прадстаўнікі навукі, на меркаваннях якіх абапіралася адзначанае рашэнне, узялі матэрыял, далёка не пераканаўчы, можна сказаць, блукалі ў храналагічных фактах, карыстаючыся толькі гіпотэзай. Можна назваць мноства такіх узгоркаў на Палессі, якія маюць падобны выгляд, але нікога з прадстаўнікоў навукі гэта не хвалюе і ніхто гэтым так горача не цікавіўся, як асабліва адзначаным узгоркам, на якім павінна паўстаць праваслаўная царква, прычым не нанова, а як адбудаваная пасля 100 гадоў свайго існавання, перарванага знішчэннем ад стыхіі»* [37, с. 383].

Падобную танальнасць і аргументацыю ўтрымліваў ліст А. Бяляева ў МУС Польшчы. *«Гэтая справа была б правільнай і мела б рацыю, калі б органы, што загадваюць аховай помнікаў, бралі канкрэтны навуковы матэрыял і не рабілі свае прапановы на дапушчэннях і меркаваннях, як у дадзенай справе, бо хутка была ўведзена такая ахова за помнікамі, то такія з самага пачатку з'яўлення павінны быць зарэгістраваныя і пра іх, як такіх, павінны ведаць, а не дзякуючы нейкаму выпадковаму выяўленню непрыкметных прадметаў, некаштоўных з пункту гледжання навукі. Адкапаныя ў час закладкі фундаментаў знаходкі і труны з астанкамі, любы скажа, перш за ўсё не могуць мець ніякага значэння для археалогіі, бо зразумела, што не толькі ў Давыд-Гарадку, але і ў іншых мясцовасцях пры земляных работах натыкаліся на труны… але гэтая акалічнасць стала абыякавай для навукі і на яе не звернута ніякай увагі»* [37, с. 383].

Адпаведны ліст А. Бяляеў накіраваў і прэзідэнту Польшчы І. Масціцкаму. *«Пры капанні зямлі для закладкі фундаментаў былі выкапаны труны з астанкамі невядомага паходжання. Гэтая акалічнасць стала зачэпкай і падставай праяўлення занадта варожых настрояў і характараў для пэўнай мясцовай досыць нязначнай групы грамадства, што з-за сваіх адсталых паняццяў і поглядаў, нават нездаровых з погляду агульнага інтарэсу дзяржаўнасці, паднялі трывогу ў прэсе, прама абвінаваціўшы ў дзікунстве і непавазе адкапаных невядомых астанкаў, хоць гэтыя труны пасля выкопвання былі перанесены паводле патрабаванняў хрысціянскай рэлігіі. Містыфікацыя дайшла да таго, што ўвесь узгорак, на якім стаяла згарэлая царква, стаў трактавацца гіс-

*тарычным помнікам быццам надзвычайнай важнасці, што прывяло да спынення ўсіх работ і, відаць, пазбавіць нас назаўсёды працягу такіх работ, а значыць мець святыню, бо іншага месца для пабудовы царквы ў Давыд-Гарадку зусім няма. Папярэднія работы, якія ўжо выкананы, складаюць суму каля 30 000 злотых, так што і з гэтага погляду мы засталіся пакрыўджанымі»* [37, с. 383].

21 мая 1937 г. на канферэнцыі з удзелам кансервацыйных уладаў прашэнні А. Бяляева былі адхілены, бо Замкавая гара пацверджана тыповым раннесярэдневяковым гарадзішчам, што падлягала ахове. Пасля адхілення Міністэрствам веравызнанняў і грамадскай асветы адпаведнай заявы Палескай праваслаўнай кансісторыі 12 чэрвеня 1937 г. ўступіла ў дзеянне рашэнне Палескага ваяводскага ўпраўлення аб прызнанні помнікам Замкавай гары ў Давыд-Гарадку.

Протаіерэй А. Бяляеў быў пераведзены настаяцелем царквы ў Камянцы, прызначаны благачынным 2-га благачыння Брэсцкага павета. Як сведчыць пратакол пасяджэння Палескай праваслаўнай кансісторыі ад 16 чэрвеня 1937 г., на вакантную пасаду настаяцеля прыхода ў Давыд-Гарадку быў пераведзены протаіерэй Юльян Самковіч, настаяцель прыхода Нараджэння Хрыстова ў Пружанах, а таксама яму даручылі выконваць абавязкі благачыннага 2-га благачыння Столінскага павета [44, с. 33].

7 ліпеня столінскі павятовы староста загадаў правесці вопіс помніка. Створаная мясцовая камісія склала 13 ліпеня 1937 г. пратакол аб захаванні Замкавай гары ў Давыд-Гарадку. Прыводзім яго ў скарочаным выглядзе (перакладзены намі з польскай мовы).

*«Сёння камісія ў складзе сакратара гарадской управы Бадасюка Матэвуша, каменданта пастарунка дзяржаўнай паліцыі Гжэсіка Мацея, работнікаў гарадской управы Яворскага Міхаіла і Казакевіча Рыгора, тэхніка гарадской управы Галкіна Уладзіміра, паводле загада павятовага старасты № XI.4 ад 7.VII. бягучага году прыбыла на месца для правядзення апісання сучаснага стану замкавай гары і пасля дасканалага даследавання і азнаямлення з тэрыторыяй, устанавіла наступнае.*

*Уся замкавая гара па ўсёй даўжыні знешняга ніжняга краю мае драўляны паркан з 2-ма ўваходамі: галоўным – з вуліц Царкоўнай і Падзамкавай. Знадворку навокал узвышша знаходзіцца ў першапачатковым стане, без ніякіх зрухаў; засаджана фруктовымі дрэвамі, а таксама дзікімі лісцевымі дрэвамі. У заходняй частцы ўзвышша на правым беразе Гарыні знаходзіцца трыангуляцыйная вежа.*

*Пры галоўным уваходзе на гару з вуліцы Царкоўнай месціцца драўляная шопа памерам 8,4 х 3,7 м, недалёка каля паркана стаіць прыбіральня 2-аддзельная, трохі далей у бок узвышша – драўляная хатка (старажоўка) памерам 6 х 8 м. Збоку хаткі стос новых дошак, а каля паркана ля шопы складзены абгарэлыя часткі згарэлай царквы, а таксама кавалкі дрэва, што дасталі з зямлі пры капанні равоў для падмурка.*

*Пасярод узвышша, на месцы, дзе стаяла да пажару 6 мая 1936 г. царква, распачаты траншэі для фундамента глыбінёй 4 м і шырынёй 3,1 м. Траншэі цяпер у запушчаным стане – зямля часткова абсыпалася з-за кліматычных умоў. У гэтых траншэях змешчаны поўнасцю скончаны фундамент даўжынёй 42,3 м, часткова зроблены фундамент на бетоннай пліце на адрэзку 47,62 м, выканана бетонная пліта толькі на адрэзку 25,9 м. Астатні адрэзак траншэй даўжынёй 23,6 м наогул не пабудаваны.*

*Ва ўсходняй частцы тэрыторыі, акружанай траншэямі, стаяць 3 драўляныя крыжы, якія пастаўлены там у мінулым годзе. Там жа за сярэднім крыжом знаходзіцца абпалены мураваны алтар з пашкоджаным жалезным крыжом са згарэлай царквы.*

*Зямля з траншэй для фундаментаў выкінута знадворку і часткова да сярэдзіны праектаванай будоўлі.*

*На поўнач ад будоўлі на адлегласці 4 м знаходзяцца 4 ямкі з гашанай вапнай, з якіх 3 засыпаны зямлёй нароўні з паверхняй тэрыторыі, а 4 – засыпана часткова. Усе ямкі глыбінёй 2 м: 3 ямкі памерам 4 × 6 м, адна ямка – 4 × 8 м.*

*У паўднёва-ўсходняй частцы ўзвышша стаіць у першапачатковым выглядзе званіца з часовай прыбудоўкай 1936 г. памерам 4,7 × 6,7 м для складвання будаўнічых матэрыялаў. Збоку ад званіцы навалена спаленая бляха і 3 скрыні з абгарэлымі цві-*

*камі, таксама стаяць падпераныя 3 жалезныя крыжы. Збоку ад франтавых дзвярэй званіцы на адлегласці 5 м на захад месціцца студня.*

*У час выкопвання ў 1936 г. траншэй для фундаментаў натыкнуліся на труны з людскімі шкілетамі, якія пахаваны на ўзвышшы ў агульнай ямцы памерам 5,5 × 3 м на ўсход ад будоўлі на адлегласці 25 м і пастаўлены драўляны крыж.*

*Па-за выкапанымі ямкамі для фундаментаў у стосах знаходзіцца абпаленая цэгла ў вялікай колькасці, не вызначанай камісіяй»* [27, арк. 45–45адв.].

У той жа дзень у Давыд-Гарадок для правядзення раскопак выехаў асістэнт Дзяржаўнага гістарычнага музея (Варшава) магістр Юзаф Марцiняк. Крыху пазней туды накіраваўся і сам Р. Якімовіч. Археалагічныя даследавані праводзіліся да другой паловы кастрычніка 1937 г. Палявыя археалагічныя даследаванні на Замкавай гары ў Давыд-Гарадку пад кіраўніцтвам Р. Якімовіча ажыццяўляліся ў 1937–1938 гг. Іх ход і выніковасць ужо прааналізаваны ў навуковай літаратуры, што адзначана ва ўводзінах дадзенага артыкула. З улікам навуковай значнасці гарадзішча і меркаваных шматгадовых раскопак планавалася выкупіць Замкавую гару, стварыць у перспектыве на месцы раскопак археалагічны запаведнік (рэзерват). Аднак адсутнасць фінансавых сродкаў, мясцовых добраахвотнікаў для дапамогі на раскопках не далі магчымасці правесці археалагічныя даследаванні летам 1939 г., а таксама рэалізаваць іншыя планы.

Змена геапалітычнага становішча восенню 1939 г. (пачатак Другой сусветнай вайны, уз'яднанне заходнебеларускіх зямель з БССР) выключыла магчымасць далейшых археалагічных раскопак на Замкавай гары ў Давыд-Гарадку, як і будаўніцтва там праваслаўнай царквы. Як ужо адзначалася, чарговыя (апошнія) раскопкі гарадзішча ў Давыд-Гарадку адбыліся ў 1967 г.

**Заключэнне**

У цэлым, спачатку пры выяўленні археалагічных артэфактаў у ходзе будаўніцтва праваслаўнай царквы ў Давыд-Гарадку ў кастрычніку 1936 г. ім не надавалася адпаведная ўвага, узнікла пэўная рызыка іх страты. Дапушчаныя тады памылкі дапаўняліся нежаданнем спыняць будаўнічыя работы. Нешматлікае кола мясцовай польскай інтэлігенцыі (пераважна каталіцкага веравызнання) дабілася таго, каб у польскіх і заходнебеларускіх СМІ была разгорнута шырокая прапагандысцкая кампанія пра гэтыя археалагічныя знаходкі. Гэта дазволіла прыцягнуць да іх вывучэння беларускіх і польскіх вучоных. Ва ўмовах вялікага грамадскага рэзанансу польскія адміністрацыйныя ўлады вымушаны былі больш актыўна рэгуляваць узнікшую сітуацыю. Мясцовая праваслаўная супольнасць разглядала спыненне будаўніцтва царквы (замест згарэлай Свята-Васкрасенскай) як праяву дыскрымінацыі, крыўды яе інтарэсаў у параўнанні з каталікамі, якія ўзвялі і асвяцілі ў 1936 г. касцёл Божага Цела. Аднак прыярытэт навуковай і грамадскай значнасці пры ацэнцы выяўленых археалагічных артэфактаў дазволіў пераадолець міжканфесійныя супярэчнасці, групавыя кан'юнктурныя інтарэсы. Замкавая гара ў Давыд-Гарадку атрымала ахоўны статус, і там у 1937–1938 гг. праводзіліся палявыя археалагічныя даследаванні гарадзішча, якія далі даволі значныя навуковыя вынікі.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. Jakimowicz, R. Dawidgródek / R. Jakimowicz. – Pińsk : Druk. Braci Wilkowiczów, 1939. – 45 s.
2. Jażdżewski, K. Roman Jakimowicz (30.04.1889–21.01.1951) / K. Jażdżewski // Archeologia. – 1955. – T. 5: 1952/53. – S. 383–389.
3. Przewoźna-Armon, K. Życie poświęcone ochronie zabytków archeologicznych i studiom nad wczesnym średniowieczem. Roman Jakimowicz (1889–1951) / K. Przewoźna-Armon // Slavia antiqua. – T. XXXIII : rok 1991/92. – S. 187–218.
4. Каханоўскі, Г. А. Якімовіч Раман Іванавіч / Г. А. Каханоўскі // Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыклапедыя. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 672.
5. Каханоўскі, Г. А. Якімовіч Раман Іванавіч / Г. А. Каханоўскі // Археалогія Беларусі : энцыклапедыя : у 2 т. – Мінск : БелЭн, 2009–2011. – Т. 2. – 2011. – С. 448.
6. Wiadomości archeologiczne. – T. LVI : 2002–2003. – Warszawa, 2003.

7. Лысенко, П. Ф. Раскопки городища древнерусского Давид-Городка в 1967 году / П. Ф. Лысенко // Древности Белоруссии : докл. к конф. по археологии Белоруссии (март, 1969) / АН БССР, Сектор археол. Ин-та истории, Белорус. о-во охраны памятников истории и культуры ; под ред. В. Д. Будько [и др.]. – Минск, 1969. – С. 352–382.

8. Лысенко, П. Ф. Города Туровской земли / П. Ф. Лысенко. – Минск : Наука и техника, 1974. – 199 с.

9. Лысенка, П. Ф. Гарадзішча / П. Ф. Лысенка // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Брэсцкая вобласць. – Мінск : БелСЭ, 1984. – С. 349.

10. Лысенко, П. Ф. Городище / П. Ф. Лысенко // Свод памятников истории и культуры Белоруссии. Брестская область. – Минск : БелСЭ, 1990. – С. 389.

11. Лысенко, П. Ф. Туровская земля (итоги и перспективы изучения) / П. Ф. Лысенко // Археологія і давня історія України : зб. наук. пр. – Київ : ІА НАН України, 2010. – Вип. 1. – С. 278–285.

12. Штыхов, Г. В. Города Белоруссии по летописям и раскопкам (IX–XIII вв.) / Г. В. Штыхов. – Минск : Полымя, 1975. – 32 с.

13. Ткачоў, М. Давыд-Гарадоцкі замак / М. Ткачоў // Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыклапедыя. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 205–206.

14. Ткачоў, М. Давыд-Гарадоцкі замак / М. Ткачоў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск : БелЭн, 1993–2003. – Т. 3. – 1996. – С. 189–191.

15. Егарэйчанка, А. А. Давыд-Гарадок / А. А. Егарэйчанка // Археалогія і нумізматыка Беларусі : энцыклапедыя. – Мінск : БелЭн, 1993. – С. 204–205.

16. Якімовіч, Ю. А. Давыд-Гарадок / Ю. А. Якімовіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мінск : БелЭн, 1984–1987. – Т. 2. – 1985. – С. 252–253.

17. Давыд-Гарадок // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. – Мінск, 2007. – Т. 4, кн. 2. – С. 577–579.

18. Шэлехаў, М. У. Давыд-Гарадок. Час і людзі / М. У. Шэлехаў. – Брэст, 2000. – 302 с.

19. Шэлехаў, М. Забытае княства / М. Шэлехаў // Берасцейскія карані ’98 : Гіст.-краязн. і літ. зб. / рэдкал.: Г. С. Тамашэвіч (гал. рэд.) [і інш.]. – Брэст, 1998. – С. 140–159.

20. Памяць : гіст.-дакум. хроніка Столінскага раёна. – Мінск : БЕЛТА, 2003. – 640 с.

21. Несцярчук, Л. М. Замкі, палацы, паркі Берасцейшчыны X–XX стагоддзяў (гісторыя, стан, перспектывы) / Л. М. Несцярчук. – Мінск : БЕЛТА, 2002. – 336 с.

22. Лабынцев, Ю. А. В глубинном Полесье (Турово-Пинская земля) / Ю. А. Лабынцев. – М. : Искусство, 1989. – 160 с.

23. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБр.). – Ф. 2003. Воп. 2. Спр. 465.

24. ДАБр. – Ф. 50. Воп. 1. Спр. 7623.

25. ДАБр. – Ф. 2059. Воп. 4. Спр. 1б.

26. ДАБр. – Ф. 2059. Воп. 4. Спр. 1в.

27. ДАБр. – Ф. 2003. Воп. 1. Спр. 1660.

28. Grobowce książąt kijowskich z XII wieku / J. M. [Józef Mackiewicz] // Słowo (Wilno). – 1936. – № 306 (7 listopada). – S. 3.

29. Echa z Puszczy Poleskiej / J. Brodacki, A. Tuskiewicz, A. Wańtowski. – Dawidgródek, 1936. – 63 s.

30. Цітовіч, І. У. Дзейнасць Польскага краязнаўчага таварыства на тэрыторыі Палескага ваяводства (1921–1939 гг.) / І. У. Цітовіч // Весн. Брэсц. ун-та. Сер. гуманітар. і грамад. навук. – 2003. – № 2. – С.71–81.

31. Вабішчэвіч, А. М. Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А. М. Вабішчэвіч. – Брэст : Выд-ва БрДУ, 2008. – 319 с.

32. Kronika // Dziennik Polski (Lwów). – 1899. – № 195 (16 lipca). – S. 2.

33. W kilku wierszach // Nowiny codzienne (Opole). – 1938. – № 142 (25 czerwca). – S. 1.

34. Hojna ofiara nauczyciela // Dziennik Bydgoski. – 1938. – № 144 (26 czerwca). – S. 11.

35. ДАБр. – Ф. 59. Воп. 5. Спр. 68.

36. Княжыя магілы ў Давід-Гарадку // Калоссе. – 1937. – № 2 (11). – С. 112–116.

37. Małachowska, S. Polskie badania archeologiczne na grodzisku w Dawidgródku nad Horyniem (Białoruś) / S. Małachowska // Wiadomości archeologiczne. – T. LVI. 2002–2003. – Warszawa, 2003. – S. 381–392.
38. Skandal… nie tylko w Dawidgródku / J. M. [J. Mackiewicz] // Słowo. – 1936. – № 320 (21 listopada). – S. 3.
39. Dyktatura naukowa szewców w Polsce / J. M. [J. Mackiewicz] // Słowo. – 1936. – № 328 (29 listopada). – S. 3.
40. Dyktatura naukowa szewców w Polsce / J. M. [J. Mackiewicz] // Dziennik Brzeski. – 1936. – 30 listopada. – S. 3.
41. Tajemnice Góry Zamkowej w Dawidgródku / R. Jakimowicz // Ilustrowany kuryer codzienny (Kraków). – 1936. – 21 grudnia. – Kuryer literacko-naukowy : dodatek. – № 51. – S. 1–2.
42. Kto był pochowany na Górze Zamkowej w Dawidgródku / R. Jakimowicz // Słowo. – 1936. – № 351 (22 grudnia). – S. 3.
43. Kto był pochowany na Górze Zamkowej w Dawidgródku / R. Jakimowicz // Kurier Nowogródzki. – 1936. – № 351 (22 grudnia). – S. 3.
44. ДАБр. – Ф. 2059. Воп. 1. Спр. 65.

## REFERENCES

1. Jakimowicz, R. Dawidgródek / R. Jakimowicz. – Pińsk : Druk. Braci Wilkowiczów, 1939. – 45 s.
2. Jażdżewski, K. Roman Jakimowicz (30.04.1889–21.01.1951) / K. Jażdżewski // Archeologia. – 1955. – T. 5: 1952/53. – S. 383–389.
3. Przewoźna-Armon, K. Życie poświęcone ochronie zabytków archeologicznych i studiom nad wczesnym średniowieczem. Roman Jakimowicz (1889–1951) / K. Przewoźna-Armon // Slavia antiqua. – T. XXXIII : rok 1991/92. – S. 187–218.
4. Kakhanouski, H. A. Yakimovich Raman Ivanavich / H. A. Kakhanouski // Arkhiealohija i numizmatyka Bielarusi : encyklapiedyja. – Minsk : BielEn, 1993. – S. 672.
5. Kakhanouski, H. A. Yakimovich Raman Ivanavich / H. A. Kakhanowski // Arkhiealohija Bielarusi : encyklapiedyja : u 2 t. – Minsk : BielEn, 2009–2011. – T. 2. – 2011. – S. 448.
6. Wiadomości archeologiczne. – T. LVI : 2002–2003. – Warszawa, 2003.
7. Lysenko, P. F. Raskopki gorodishcha drevnerusskogo David-Gorodka v 1967 godu / P. F. Lysenko // Drevnosti Belorussii : dokl. k konf. po arkheologii Belorussii (mart, 1969) / AN BSSR, Sektor arkheol. In-ta istorii, Belorus. obshch-vo okhrany pamiatn. ist. i kul’t. ; pod red. V. D. Bud’ko [i dr.]. – Minsk, 1969. – S. 352–382.
8. Lysienko, P. F. Goroda Turovskoj ziemli / P. F. Lysienko. – Minsk : Nauka i tiekhnika, 1974. – 199 s.
9. Lysienka, P. F. Haradzishcha / P. F. Lysienka // Zbor pomnikau historyi i kul’tury Bielarusi. Bresckaja voblasc’. – Minsk : BielSE, 1984. – S. 349.
10. Lysienko, P. F. Gorodishchie / P. F. Lysienko // Svod pamiatnikov istorii i kul’tury Bielorussii. Briestskaja oblast’. – Minsk : BielSE, 1990. – S. 389.
11. Lysienko, P. F. Turovskaja ziemlia (itogi i pierspiektivy izuchienia) / P. F. Lysienko // Arkheolohija i davnia istorija Ukrajny : zb. nauk. pr. – Kyjv : IA NAN Ukrajny, 2010. – Vyp. 1. – S. 278–285.
12. Shtykhov, G. V. Goroda Bielorussii po lietopisiam i raskopkam (IX–XIII vv.) / G. V. Shtykhov. – Minsk : Polymia, 1975. – 32 s.
13. Tkachou, M. Davyd-Haradocki zamak / M. Tkachou // Arkhiealohija i numizmatyka Bielarusi : encyklapiedyja. – Minsk : BielEn, 1993. – S. 205–206.
14. Tkachou, M. Davyd-Haradocki zamak / M. Tkachou // Encyklapiedyja historyi Bielarusi : u 6 t. – Minsk : BielEn, 1993–2003. – T. 3. – 1996. – S. 189–191.
15. Yeharejchanka, A. A. Davyd-Haradok / A. A. Yeharejchanka // Arkhiealohija i numizmatyka Bielarusi : encyklapiedyja. – Minsk : BielEn, 1993. – S. 204–205.
16. Yakimovich, Yu. A. Davyd-Haradok / Yu. A. Yakimovich // Encyklapiedyja litaratury i mastactva Bielarusi : u 5 t. – Minsk : BielEn, 1984–1987. – T. 2. – 1985. – S. 252–253.

17. Davyd-Haradok // Harady i vioski Bielarusi : encyklapiedyja. – Minsk, 2007. – T. 4, kn. 2. – S. 577–579.

18. Sheliekhau, M. U. Davyd-Haradok. Chas i liudzi / M. U. Sheliekhau. – Brest, 2000. – 302 s.

19. Sheliekhau, M. Zabytaje kniastva / M. Sheliekhau // Bierasciejskija karani ’98 : hist.-krajazn. i lit. zb. / redkal.: H. S. Tamashevich (hal. red.) [i insh.]. – Brest, 1998. – S. 140–159.

20. Pamic’ : hist.-dakum. khronika Stolinskaha rajona. – Minsk : BELTA, 2003. – 640 s.

21. Niesciarchuk, L. M. Zamki, palacy, parki Bierasciejshchyny X–XX stahoddziau / L. M. Niesciarchuk. – Minsk : BELTA, 2002. – 336 s.

22. Labyncev, Yu. A. V glubinnom Polies’je (Turovo-Pinskaja ziemlia) / Yu. A. Labyncev. – M. : Iskusstvo, 1989. – 160 s.

23. Dziarzhauny arkhiu Bresckaj voblasci (DABr.). – F. 2003. Vop. 2. Spr. 465.

24. DABr. – F. 50. Vop. 1. Spr. 7623.

25. DABr. – F. 2059. Vop. 4. Spr. 1b.

26. DABr. – F. 2059. Vop. 4. Spr. 1v.

27. DABr. – F. 2003. Vop. 1. Spr. 1660.

28. Grobowce książat kijowskich z XII wieku / J. M. [Józef Mackiewicz] // Słowo (Wilno). – 1936. – № 306 (7 listopada). – S. 3.

29. Echa z Puszczy Poleskiej / J. Brodacki, A. Tuskiewicz, A. Wańtowski. – Dawidgródek, 1936. – 63 s.

30. Citovich, I. U. Dziejnasc’ Pol’skaha krajaznauchaha tavarystva na terytoryi Palieskaha vajavodstva (1921–1939 hh.) / I. U. Citovich // Viesn. Bresc. un-ta. Sier. humanitar. i hramad. navuk. – 2003. – № 2. – S.71–81.

31. Vabishchevich, A. M. Nacyjanal’na-kul’turnaje zhyccio Zakhodniaj Bielarusi (1921–1939 hh.) / A. M. Vabishchevich. – Brest : Vyd-va BrDU, 2008. – 319 s.

32. Kronika // Dziennik Polski (Lwów). – 1899. – № 195 (16 lipca). – S. 2.

33. W kilku wierszach // Nowiny codzienne (Opole). – 1938. – № 142 (25 czerwca). – S. 1.

34. Hojna ofiara nauczyciela // Dziennik Bydgoski. – 1938. – № 144 (26 czerwca). – S. 11.

35. DABr. – F. 59. Vop. 5. Spr. 68.

36. Kniazhyja mahily u David-Haradku // Kalossie. – 1937. – № 2 (11). – S. 112–116.

37. Małachowska, S. Polskie badania archeologiczne na grodzisku w Dawidgródku nad Horyniem (Białoruś) / S. Małachowska // Wiadomości archeologiczne. – T. LVI. 2002–2003. – Warszawa, 2003. – S. 381–392.

38. Skandal… nie tylko w Dawidgródku / J. M. [J. Mackiewicz] // Słowo. – 1936. – № 320 (21 listopada). – S. 3.

39. Dyktatura naukowa szewców w Polsce / J. M. [J. Mackiewicz] // Słowo. – 1936. – № 328 (29 listopada). – S. 3.

40. Dyktatura naukowa szewców w Polsce / J. M. [J. Mackiewicz] // Dziennik Brzeski. – 1936. – 30 listopada. – S. 3.

41. Tajemnice Góry Zamkowej w Dawidgródku / R. Jakimowicz // Ilustrowany kuryer codzienny (Kraków). – 1936. – 21 grudnia. – Kuryer literacko-naukowy : dodatek. – № 51. – S. 1–2.

42. Kto był pochowany na Górze Zamkowej w Dawidgródku / R. Jakimowicz // Słowo. – 1936. – № 351 (22 grudnia). – S. 3.

43. Kto był pochowany na Górze Zamkowej w Dawidgródku / R. Jakimowicz // Kurier Nowogródzki. – 1936. – № 351 (22 grudnia). – S. 3.

44. DABr. – F. 2059. Vop. 1. Spr. 65.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 28.03.2023*